3. Гинзбург, Л. Я. О психологической прозе. – Л. : Худож. лит., 1977. – 449 с.

4. Доманский, В. А. Герои Тургенева как психологические и культурные типы / В. А. Доманский // Два века русской классики: в 4 т. Т. 2. – СПб., 2022. – С. 64–81.

5. Интернет сообщество СПС / [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://discord.gg/kj24p****. – Дата доступа: 08.11.2022

6. Консультативные материалы, предоставленные врачом психоневрологом Голубко Еленой Валерьевной.

7. Маркович, В. М. Человек в романах И. С. Тургенева. – Л. : Ленингр. гос. ун-т, 1975. – 154 с.

8. Тимофеев, Л. И. Словарь литературоведческих терминов / ред.-сост. Л. И. Тимофеев и С. В.Тураев. – М. : «Просвещение». – 1974. – С. 509.

9. Тургенев, И. С. Отцы и дети. Дворянское гнездо. Рудин / И. С. Тургенев. – Минск : БелАКК, 1999. – 512 с.

10. Устройство МП человека [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.slav-nayka.com/blog/azy-prikladnoy-nauki/ustroystvo-modeli-povedeniya-cheloveka . – Дата доступа: 08.11.2022

11. Шкловский, Е. Энциклопедия литературных героев: Русская литература второй половины 19 века / сост. Е. Шкловский. – М. : ООО «Агентство» КРПА Олимп» : ООО «Издательство АСТ», 2001 –768 с.

12. Юнг, К. Г. Психологические типы: монография / К. Г. Юнг ; Пер. Е. И. Рузера. – М.: Алфавит, 1992. – 105 с.

## ВОБРАЗ ПАДЛЕТКА-ПАРТЫЗАНА ФЛЁРЫ ГАЙШУНА Ў «ХАТЫНСКАЙ АПОВЕСЦІ» АЛЕСЯ АДАМОВІЧА

***К. Ю. Фядотка***

*ДУА «Ліцэй № 2 г. Мінска», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – А. К. Пекач, настаўнік-метадыст*

**Анатацыя.** У артыкуле аналізуецца ўнутраны стан галоўнага героя «Хатынскай аповесці» Алеся Адамовіча – падлетка Флёры Гайшуна, вызначаюцца пачуцці (крыўда, унутраны жах) героя ў экстрэмальных умовах ваеннага часу; усведамляецца аналіз героем перажытага, яго імкненне да асэнсавання чалавечай псіхікі, да спасціжэння чалавечай душы; асэнсоўваецца

адчуванне супярэчлівасці паміж жыццём і смерцю, дынаміка псіхалагічных станаў чалавека на вайне.

**Ключавыя словы:** праўда вайны; мяжа на вайне; «несіметрычны» характар; пачуццё дваістасці; унутраны жах; боль памяці.

Характар падлетка-партызана Флёры Гайшуна, як адзначае сам Алесь Адамовіч, незвычайны, індывідуальны, своеасаблівы, «несіметрычны» [2, с. 6], і мы верым гэтаму хлопчыку больш, чым паверылі б дасканала выпісанаму аўтарам характару. Карціна свету Флёры Гайшуна адметная, найперш трагічная. Так, напрыклад, ступень крыўды ў гэтага дзіцяці не мае межаў: яе канцэнтрацыя неймаверная, гэта крыўда на ўвесь свет, абараніцца ад яе немагчыма, абараніцца можна толькі ёю самою, значыць, стане табе яшчэ горш, стане зусім кепска, так кепска, што не толькі ад гэтага можна памерці, але і насамрэч памрэш: «Ва мне жыла такая бязмежная, такая дзіцячая крыўда на ўвесь свет, што абараняцца я мог толькі ёю, жадаючы толькі, каб мне было яшчэ горш, каб зусім ужо кепска было і каб памерці на злосць ці на радасць усім ім…» [1, с. 107]. Праз пачуццё крыўды, а таксама праз пачуццё помсты, якое з’яўляецца ў хлопца, праз смерць і раны, праз полымя вёсак Флёра Гайшун сталее, яго псіхіка зрушваецца і пераўтвараецца: накопліваюцца ўспаміны, яны ціснуць на Флёру, не даюць жыць далей, не даюць думаць пра будучыню. З кожным часам расце ў юнака кошт чалавечага жыцця, жыцця людзей, якіх так лёгка забіваюць на яго вачах у партызанскіх баях, у «вогненных» вёсках.

Флёра лічыць сябе надта непрыгожым, «пачварай, нават калі вочы былі» [1, с. 30], і толькі пазней усведамляе, што чалавек з вачамі не можа быць такім, разумее, што гэта яго і не цікавіла да сустрэчы з Глашай, а спадабаўся ён сабе, калі ў атрад трапіў, нават дужа з гэтай нагоды стаў сабе падабацца: «Вінтоўка, граната – партызан! Якой яшчэ прыгажосці ад чалавека трэба!» [1, с. 30]. І сапраўды, найперш прыгажосць не знешняя павінна быць, не вонкавая, а прыгажосць, маральнасць душэўная, духоўная, якая прыводзіць да правільнага выбару, да годных учынкаў.

Хапае сілы, моцы ў героя прыняць праўду, і хоць яна страшная, пазбаўляе надзеі і хочацца схавацца ад яе, але ён прызнае яе, ведае і бачыць: «Я ўжо ведаў, бачыў праўду – чорны тунэль, уваход у яго. Але ўсё яшчэ з надзеяй некага маліў, не ўваходзіў: толькі не гэта, толькі не туды! Я ўжо хаваўся за сваю глухату, якая аддаляла ўсю праўду, аддаляла імгненне, калі больш не застанецца надзеі» [1, с. 71].

Калі хлопец стаў партызанам, адчуў сапраўдную сутнасць вайны і фашызму. Ён прымаў удзел у баях, бачыў смерці сваіх таварышаў і ворагаў, сам быў цяжка паранены і амаль спалены зажыва ў «вогненнай» вёсцы. Нягледзячы на такія жахі, Флёра верыў, адчуваў, што яго родныя жывыя, яны ўратаваліся і схаваліся на «востраве» сярод партызанаў. Але ўсё атрымалася не так: вайна

несправядліва абышлася з сялянскім хлопчыкам Флёрам, вайна ўвогуле несправядлівая. Вярнуўшыся ў родную вёску, Флёра пабачыў толькі згарэлыя хаты, руіны сялянскіх будынкаў, пустэчу. Ад яго хаты засталося толькі месца ў канцы вёскі, толькі вуголле, белае вуголле каля ацалелай печы, якое нагадвала згарэлыя чалавечыя косці.

Унутраны жах хлопчыка пастаянна нарастае, Флёра змагаецца з ім, калі ідзе насустрач начной страляніне і пажарам, шуму баёў, смерцям, трывожнай невядомасці, не можа паверыць, згадзіцца, «што я – гэта той, у каго так страшна забілі маму, сястрычак, што гэта і ёсць я!» [1, с. 82]. Цяжка перарасці гэты жах, бо, «...калі забітых ты бачыў жывымі, заўважаеш, што наваколле не адразу прымае мёртвага: усе наўкол павінна прывыкнуць да яго прысутнасці <...> Забілі чалавека, чалавека не стала, і тады паяўляецца вось гэта – нерухома ляжаць на траве. Магчыма, да вечара заб'юць і цябе, і зноў нешта паявіцца ў свеце, і гэтак жа, як ты цяпер, нехта, чыесьці вочы будуць прывыкаць да гэтага» [1, с. 91–92], але яго трэба прыняць, жыць з ім: «Што вайна, што немцы, смерць побач – гэта ўжо не перашкаджае мне быць» [1, с. 83]. Флёра разумее, што ён ужо не той, надта змяніўся, страціў сябе ранейшага, знаходзіцца ў дзіўным стане і яшчэ не ўсведамляе, куды гэтыя змены яго прывядуць, якім ён стане, якім выйдзе з гэтай бяды і ўвогуле ці выйдзе: «Але на свеце ўсё яшчэ няма мяне, у каторага ўсіх забілі» [1, с. 83]. А пакуль ён адзін, не проста адзін, а адзін на адзін з ворагамі, а той, што свой, ужо мёртвы, чужы, і патрэбна адвага, каб не глядзець, не думаць, каб скончыць хуткае развітанне, не адчуўшы ўсяго: «З нейкага імгнення ўжо не дазваляў падступіцца да сябе ўсяму, што адбылося: я быў перапоўнены, а лішак выцякаў цераз край. На шчасце, для чалавека такое магчыма» [1, с. 104]. Герой траціць адчуванне рэальнасці, паддаецца жаданню ўсё адпусціць, не кантраляваць, перачакаць, становіцца безуважным і нерухомым. Праўда, гэта ненадоўга: нягледзячы на тое, што ён «толькі жыхар вёскі Пераходы» [1, с. 115], але ж з гранатай – партызан, які сам зможа распарадзіцца сваёй смерцю: «У ёй [гранаце] мая смерць, але смерць, якой я сам распараджуся, а не тая, якая паўстане перада мной і спакойна, колькі ёй захочацца, будзе мяне разглядваць, перш чым забіць… [1, с. 115].

На думку М. Тычыны, характар Флёры Гайшуна нетыповы, «асабліва калі мець на ўвазе перажытае беларусамі» [2, с. 7], даследчык лічыць, што «гэта характар жывы, які заўсёды памятае пра рысу, дзе пачынаецца недазволенае, забароненае, бесчалавечнае» [2, с. 7]. Дзе ж мяжа на вайне для чатырнаццацігадовага хлопчыка? Ён яе вызначае: калі так невыносна балюча, што не можаш ужо праз гэтую вайну плакаць; калі высыхаюць слёзы; калі не можаш скардзіцца; калі кожны загінулы – страта назаўсёды, праз якую хочацца ўцячы адсюль; мяжа, «табой пераадоленая і пакінутая: на ёй нечае жыццё і нечая смерць, але ўжо не твая смерць» [1, с. 176].

Кожная падзея на вайне з'яўляецца своеасаблівай «мяжой» паміж дзяцінствам і сталасцю Флёры. З кожным выпрабаваннем лёсу герой усё больш асэнсоўвае сваё жыццё і становіцца зусім іншым, «дарослым», калі можна так сказаць; псіхічна падрыхтаваным да цяжкіх жыццёвых сітуацый, зразумела, на колькі гэта магчыма; замкнёным і сканцэнтраваным на самім сабе. Ён ведаў і раней, што смяротны, а зараз пра гэта не толькі ведае, але і адчувае: «Той, хто быў хоць аднойчы паранены ці кантужаны, ужо не ранейшы чалавек. Ён ужо адчуў, як гэта будзе. Да гэтага толькі ведаў, што смяротны, а цяпер – адчуў» [1, с. 42]. І не проста адчувае, але і прымае, разумее, што ў кожную хвіліну можа загінуць. І такім, пройдзе час, ён будзе сабе падабацца нават больш, чым дарослым: «Так ці інакш, але Флёра, той, што ляжаў над гранатай, куды больш сімпатычны мне самому, чым ягоны нашчадак Фларыян Пятровіч, што так трымаецца за сваё аслеплае жыццё, за крыўднае каханне сваё, якое надта ўжо нагадвае посах сляпога» [1, с. 89 – 90].

Паказальным момантам змяненняў псіхікі Флёры з'яўляюцца яго адносіны да свайго кіраўніка, камандзіра партызанскага атрада Касача. Калі хлопец толькі трапіў у атрад, ён палюбіў Касача, той для яго быў самым важным чалавекам на свеце; пазней сітуацыя змянілася, і Флёра адчувае напружанне побач з камандзірам. Пасляваеннага ж Касача Фларыян Пятровіч не ведаў, але адчуваў нейкі холад ад яго прысутнасці. Хоць сам камандзір зусім не змяніўся падчас вайны, застаўся тым жа, думкі героя наконт Касача кардынальна змяніліся, што таксама сведчыць пра змены ў душы самога Флёры.

Не пакідае Флёру і пачуццё дваістасці: «Ты і нехта там (яшчэ не ведаеш, дзе і хто) ужо звязаны: вам забіваць адзін аднаго. І таму, што ведаеш пра гэта, а ён яшчэ не – ты і за яго ўяўляеш: як пачуе першыя стрэлы, як спалохана ўсхопіцца… Табе самому такое знаёмае: і аглушальныя, як удар у дзверы, першыя стрэлы, і дзіўнае пачуццё палёгкі перад рэальнай нарэшце небяспекай [1, с. 39].

Ці, напрыклад, дваістае адчуванне сябе самога праз дзіўны сон, у якім ён, Флёра, ляціць у самалёце і бачыць там, унізе, таксама хлопчыка Флёру, але нейкага іншага, нейкую іншую сваю іпастась, і не ведае, хто з іх уратуецца, але так хоча, каб хоць каторы застаўся жывы: «Сон адзін мне запомніўся, і не сам наогул сон, а ягонае адчуванне, незвычайнае, дваістае. Быццам я ўверсе, на самалёце, але ўнізе – таксама я. І бачу сябе, і баюся самога сябе: ганяю па голым, як стол, полі таго, што ўнізе, – базабароннага, маленькага. І раптам маленькі, спалоханы, злосны – таксама я – падае на спіну і страляе, страляе ў самалёт, я адчуў, што пацэліў і што падаю, лячу на таго, што пада мной, – вось-вось стрэцімся, разаб'ёмся адзін аб аднаго, і я прашу, малю, каб хоць нехта з нас двух застаўся, ацалеў…» [1, с. 66]. Зразумела, тое, што адбываецца з героем насамрэч, і тое, што прыходзіць падчас трызнення, падчас сну, паглыбляе ўзаемаразуменне яго агульнай карціны свету.

Як нам падаецца, яшчэ падлеткам у цяжкія ваенныя гады Флёра Гайшун, сам таго не ўсведамляючы, імкнуўся да асэнсавання чалавечай псіхікі, да спасціжэння чалавечай душы, ужо тады адрозніваў дабро і зло, што, безумоўна, не магло не паўплываць на будучую пасляваенную дзейнасць ветэрана Фларыяна Пятровіча. Так, напрыклад, Флёра ў такім маладым узросце адчуваў супярэчлівасць паміж жыццём і смерцю: «Па-сапраўднаму свабодны той, хто гатовы пайсці на смерць, гэта і сёння справядліва» [1, с. 89]; «Ці не рабскае гэта жаданне, прынамсі, на сённяшняй планеце, – жыць і жыць?» [1, с. 89].

Флёра ўсведамляе і аналізуе перажытае як сталы, вопытны, сумленны чалавек, азіраецца на мінулае, глядзіць у будучыню, у якой заціраецца памяць мінулага, і зноў паварочваецца сваёй памяццю і болем у сэрцы да мінулага, безнадзейна разумеючы, што магло быць па-іншаму: «Калі глядзіш на перажытае, яно ўяўляецца адной-адзінай лініяй, наперад зазіраеш – гэтых ліній цэлы пучок, і ўсе яны значаць дарогі, толькі не ведаеш яшчэ, якая з іх адзіная. Пражыў месяц, дзень, мінуту, і тое, што было пучком, абшморгваецца, агаляецца, як галінка, заціснутая ў моцным кулаку, – толькі пацягні яе. Але нават пасля таго, як застаўся толькі гэты голы дубчык, чалавек будзе зноў і зноў азірацца – з безнадзейнай спробай вярнуцца да таго моманту, калі ўсё магло быць па-другому. Калі не было гэтай аголенай, бязлітаснай, адзінай праўды…» [1, с. 71].

Розум Фларыяна Пятровіча, зрушаны памяццю пра вайну, яго душа, што не перастае шчымець і балець, маральныя якасці ніколі не дазволяць забыцца на вайну, заўсёды будуць вяртаць да гэтых жахаў; праблема вайны і фашызму павінна быць даследавана і павінны быць зроблены вывады ўсімі, каб гэтыя жахі не паўтараліся ніколі.

За маральныя, духоўныя якасці Глаша сапраўды палюбіла Флёру, нягледзячы на тое, што ён быў негаваркім, душэўна замкнёным, сляпым, трымаўся за жыццё толькі памяццю. Глаша захацела быць з гэтым чалавекам, захацела стварыць сям'ю, а свае самыя высокія маральныя якасці найбольш шчыра выявіла падчас самых цяжкіх сямейных выпрабаванняў: «Глаша пайшла за такога замуж, але яна, мусіць, у нейкім іншым люстэрку мяне бачыла, не ў такім бязлітасным. <…> Пакуль я яшчэ быў, як усе (толькі час ад часу пачыналі балець, чырванелі вочы), жыццё з Глашай у нас не надта ладзілася: тое, што нас зблізіла, тое і падзяляла, мучыла. Наша сумеснае партызанства, Касач… Не гаварылі мы, не ўспаміналі ўголас, але гэта было з намі, чулася. А калі са мной здарылася самае страшнае (за нейкіх паўгода), Глашу як падмянілі – яе голас, яе рукі, яе дотык. І яна сама захацела, каб нарадзіўся Сярожа» [1, с. 20].

Такім чынам, характар Флёры Гайшуна жывы, рухомы: ступень крыўды ў падлетка-партызана не мае межаў, яе канцэнтрацыя неймаверная, але ў яго хапае

сілы, моцы прыняць праўду; нягледзячы на тое, што ўнутраны жах хлопчыка пастаянна нарастае, Флёра змагаецца з ім, вызначае мяжу на вайне, памятае пра рысу, дзе пачынаецца недазволенае, забароненае, бесчалавечнае, адчувае супярэчлівасць паміж жыццём і смерцю. Герой усведамляе і аналізуе перажытае, паварочваецца сваёй памяццю і болем у сэрцы да мінулага.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Адамовіч, А. Хатынская аповесць / А. Адамовіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 237 с.
2. Тычына, М. А. Аб мінулым дзеля будучыні / М. А. Тычына // Хатынская аповесць / Алесь Адамовіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 3–8.


## ЭФФЕКТИВНЫЕ СПОСОБЫ ФОРМИРОВАНИЯ БЛАГОПРИЯТНОЙ ЯЗЫКОВОЙ СРЕДЫ УЧАЩИХСЯ


***К. Ю. Цой***
*ГУО «Гимназия № 2 г. Минска»*

*Научный руководитель – С. А. Бирина,*
*учитель русского языка и литературы высшей категории*



**Аннотация.** Необходимость формирования высокого уровня языковой среды очевидна. Один из путей – изучение учебного предметов «Русский язык» и «Русская литература», роль которых трудно переоценить в данной ситуации. Эти учебные дисциплины занимают особое место в школьном цикле, формируя основные, базовые умения для становления, развития каждого учащегося. Следует отметить и то, что на русском языке проходит обучение в большинстве школ Беларуси – это язык познания.



**Ключевые слова:** языковая среда; владение языковыми нормами; задания ЦЭ; формирование аналитического чтения; мнемоника.


Языковая среда – исторически сложившееся объединение людей на основе общего языка и культуры, проживающих на определённой территории. Это среда связана со всеми нашими привычными делами: учёбой, работой, проведением досуга с семьёй или друзьями, развитием творческих способностей; влияет на наше мировосприятие, грамотность речи и, конечно, на результаты экзаменов.

В этой связи учебные предметы «Русский язык» и «Русская литература» играют важнейшую роль в формирования благоприятной языковой среды учащихся.